Ірына Жэлянгоўская

Загадчык аддзела Брэсцкай абласной
бібліятэкі імя Максіма Горкага

# Праект «Гістарычныя сімвалы Брэста»: да 1000-годдзя горада

У юбілейны для Брэста год асабліва значным з'яўляецца развіццё краязнаўчай дзейнасці ўстаноў культуры рэгіёна, што садзейнічае фарміраванню яго станоўчага іміджу. Асветніцкая, даследчая і мемарыяльная функцыі бібліятэкі становяцца больш актуальнымі і запатрабаванымі грамадствам. Асабліва значнай робіцца і гістарычная дакладнасць лакальных падзей. Важную ролю тут адыгрываюць фактаграфічныя і бібліяграфічныя рэсурсы, навуковыя, дакументальныя, публіцыстычныя матэрыялы па гісторыі і культуры краю.

Краязнаўчая дзейнасць заўсёды з'яўлялася прыярытэтнай у працы любой бібліятэкі, і Брэсцкая абласная бібліятэка імя Максіма Горкага, безумоўна, не выключэнне. Выяўленне, збор, арганізацыя, захаванне, прадастаўленне ў карыстанне чытачу краязнаўчых і мясцовых дакументаў – асноўныя напрамкі дзейнасці аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі.

Аддзелам вядзецца сістэматычная праца па выяўленні краязнаўчых матэрыялаў і мясцовых выданняў, дакамплектаванні і капіраванні адсутных крыніц, стварэнні асабістых друкаваных і электронных рэсурсаў; арганізацыі, сістэматызацыі і захаванні архіва мясцовага друку. Супрацоўнікамі аддзела на прадмет краязнаўства апрацоўваюцца каля 160 найменняў перыёдыкі, распісваюцца зборнікі, якія паступаюць у бібліятэку. У карыстанне чытачоў прадастаўлены аб'ёмны даведачна-бібліяграфічны апарат.

У аддзел трапляюць кантрольныя экзэмпляры ўсёй друкаванай прадукцыі, якая выдаецца на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. Абавязковы бясплатны экземпляр з'яўляецца адным з галоўных крыніц папаўнення фонду. Шляхам кнігаабмену (часам у выглядзе ксеракопій і электронных копій) набываюцца замежныя выданні па гісторыі рэгіёна. Папаўненне фонду ў якасці дара ад краязнаўцаў, пісьменнікаў, навукоўцаў таксама з'яўляецца актуальным для бібліятэкі.

На сённяшні дзень кніжны фонд аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага налічвае больш за 40 тыс. адзінак на беларускай, рускай, польскай, украінскай і іншых мовах; каля 40 папак малых форм друкаваных выданняў Брэсцкай вобласці (буклетаў, афіш, плакатаў, паштовак і інш.). У складзе фонду існуюць дакументы на папяровых і электронных носьбітах, аўдыя- і відэаматэрыялы, сярод іх значная колькасць у выглядзе рукапісаў, ксеракопій, газетных выразак. Фонд складаюць навуковыя, навукова-папулярныя, даведачныя, вучэбныя, бібліяграфічныя, мастацкія выданні і інш.

Бібліятэчны фонд кааштоўны таксама і сваёй тэматычнай разнастайнасцю, значная доля якой адводзіцца гісторыі Берасцейшчыны і, у прыватнасці, самога Берасця (ад першых летапісных узгадак да сучасных грунтоўных даследаванняў). Гэтыя працы як агульнага характару, так і прысвечаныя розным гістарычным перыядам ці падзеям.

На сённяшні дзень аддзелам краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі вядзецца і актыўная асветніцкая дзейнасць: ладзяцца кніжныя выставы, прэзентацыі, сустрэчы з цікавымі людзьмі рэгіёна, прымаецца ўдзел у доўгатэрміновых праектах бібліятэкі.

На пачатку 2019 г. Брэсцкая абласная бібліятэка імя Максіма Горкага прэзентавала свой новы праект «Гістарычныя сімвалы Брэста» (да 1000-годдзя горада). У рамках якога бібліятэка праводзіла серыю адкрытых публічных лекцый, прысвечаных асноўным культурным сімвалам рэгіёна: Брэсцкай Бібліі, Брэсцкай уніі, Брэсцкаму міру і Брэсцкай крэпасці. Каардынацыю працы здзяйсняў аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі. Цыкл мерапрыемстваў быў разлічаны на год і рэалізоўваўся ў некалькі этапаў. На ўсіх этапах асвятляўся ў рэгіянальных СМІ і на сайце бібліятэкі.

Сярод асноўных задач праекта можна выдзеліць такія, як фарміраванне станоўчых адносін да гістарычнай і культурнай спадчыны горада; стварэнне новых форм бібліятэчнай працы для прасоўвання чытання краязнаўчай літаратуры; прыцягненне да сумеснай дзейнасці вядомых спецыялістаў у навуковай сферы, для шырокага распаўсюджвання новых крыніц і ведаў па рэгіянальнай гісторыі.

Праект «Гістарычныя сімвалы Брэста» таксама накіраваны на папулярызацыю краязнаўчых дакументаў і матэрыялаў з фонду Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага і на развіццё зацікаўленасці жыхароў горада ў вывучэнні кніжнай культурна-гістарычнай спадчыны.

Вядома, што адным з галоўных сродкаў масавай работы для прыцягнення чытача ў бібліятэку з'яўляецца кніжная выстава. З самага пачатку працы над «Гістарычнымі сімваламі Брэста» арганізатары імкнуліся зрабіць акцэнт на раскрыцці кніжных фондаў бібліятэкі, якія больш поўна адлюстроўваюць тыя знакавыя падзеі, што адыгрывалі значную ролю ў сусветнай гісторы і гісторыі горада ў прыватнасці.

Спецыяльна да лекторыя супрацоўнікамі бібліятэкі была распрацавана канцэпцыя і падрыхтавана кніжная выстава «Брэст. 1000 гадоў гісторыі», на якой прадстаўлена гісторыя і лёс нашага горада праз дакументы і матэрыялы з фондаў Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага, якія адлюстроўваюць культурна-гістарычны і рэлігійны фон 1000-гадовага горада (у рамках праекта экспанаваліся матэрыялы і дакументы з фондаў аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі, а таксама сектара рэдкай кнігі). Храналагічны ахоп крыніц: з 1563 г. (дата выхаду Брэсцкай Бібліі) – да сённяшніх дзён (самыя новыя даследаванні і публікацыі).

Выстава «Брэст. 1000 гадоў гісторыі» была праілюстравана разнастайнымі відамі дакументаў: кнігамі, перыядычнымі выданнямі, аудыя- і відэаматэрыяламі, буклетамі, афішамі і паштоўкамі, а таксама рэдкімі выданнямі і іх ксеракопіямі. Унікальныя матэрыялы экспанаваліся на кожным этапе праекта, на працягу кожнай лекцыі.

Ядром дадзенай выставы і своеасаблівай яе адметнасцю з'явіліся рэсурсы ўласнай генерацыі абласной бібліятэкі, а менавіта – навуковы зборнік «Брэсцкая Біблія – унікальны помнік культуры XVI стагоддзя: новыя даследаванні і матэрыялы» (Мінск, 2015), бібліяграфічныя паказальнікі «Брестский мир: 95 лет со дня подписания» (Брэст, 2013) і «Брэсцкая унія 1596 года» (Брэст, 2018).

Усяго ў рамках праекта былі запланаваны і праведзены чатыры сустрэчы. Дзякуючы лекторыю на сустрэчах з навукоўцамі мелі магчымасць прысутнічаць самыя розныя ўзроставыя катэгорыі берасцейцаў.

Лектарам першай сустрэчы праекта стаў А. Суша, намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, які выступіў з відэапрэзентацыяй «Берасцейская Біблія як культурны брэнд горада, вобласці, краіны». Ён закрануў тэмы вывучэння эпохі айчыннага Адраджэння і Рэфармацыі, гісторыі кнігавыдавецкай справы і Берасцейскай друкарні XVI ст., жыцця і дзейнасці асобы князя-асветніка Мікалая Радзівіла Чорнага. Асноўная ўвага была нададзена непасрэдна гісторыі стварэння і вывучэння знакамітага сімвала горада – Брэсцкай Бібліі. Славуты фрагмент Брэсцкай (Радзівілаўскай) Бібліі, набыты бібліятэкай у 2013 г., экспанаваўся ў першым раздзеле выставы «Брэст. 1000 гадоў гісторыі».

Выступоўцам другой лекцыі «Брэсцкая унія ў гісторыі Брэста і лёсах еўрапейскай цывілізацыі» ў рамках праекта стаў А. Свірыд, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі славянскіх народаў гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна. Ён растлумачыў перадумовы, прычыны, прыняцце і эвалюцыю Брэсцкай царкоўнай уніі, узгадаў асноўныя навуковыя працы і навукоўцаў, якія займаліся даследаваннем дадзенай тэмы.

Трэцюю сустрэчу (з лекцыяй «Брэсцкі мір у гісторыі горада, краіны, свету») правёў А. Вабішчэвіч, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна. Ён распавёў прысутным аб падзеях, звязаных з падрыхтоўкай і правядзеннем мірных перамоў у Брэст-Літоўску ў 1918 г., адзначыў складанасць, цікавасць і значнасць гэтай падзеі для Беларусі, у прыватнасці, і цалкам для сусветнай гісторыі пачатку XX ст.

У 2014 г. Брэсцкая абласная бібліятэка рэалізавала праект па стварэнні паўнатэкставай электроннай базы даных «Брестский мир», якая складаецца з публікацый з розных кніг, артыкулаў з часопісаў, газет, ілюстрацыйных матэрыялаў. Рэсурс знаходзіцца на субдамене «Краязнаўства Берасцейшчыны» афіцыйнага сайта Брэсцкай абласной бібліятэкі імя Максіма Горкага.

Размяшчэнне краязнаўчых матэрыялаў на сайце бібліятэкі адкрывае новыя магчымасці забеспячэння іх даступнасці, папулярызацыі дакументальнай спадчыны. Субдамен «Краязнаўства Берасцейшчыны» яднае і каардынуе краязнаўчую інфармацыю бібліятэкі і бібліятэк вобласці. Нязменнай папулярнасцю ў калег, спецыялістаў і чытачоў карыстаюцца электронныя базы даных уласнай генерацыі «Спадчына» і «Памяць», электронны інфармацыйны рэсурс «Хроніка культурнага жыцця», электронны краязнаўчы каталог і інш.

Чацвёртая і апошняя сустрэча ў рамках праекта адбылася ў верасні. Яе лектар – У. Здановіч, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Беларусі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна. Ён распавёў прысутным аб шматлікіх і разнастайных падыходах да вывучэння і ацэнкі тэмы «Абарона Брэсцкай крэпасці», спрэчных пытаннях і складанасцях яе даследавання. Лектар таксама звярнуў увагу на традыцыйныя і новыя напрацоўкі, гістарыяграфію тэмы.

У ходзе працы над праектам «Гістарычныя сімвалы Брэста» пашырыліся партнёрскія ўзаемасувязі з арганізацыямі і грамадскімі аб'яднаннямі, навукоўцамі і краязнаўцамі, насельніцтвам горада. Арганізатары спадзяюцца, што праект з'явіўся добрым падарункам усім жыхарам і гасцям Берасця. Брэсцкая абласная бібліятэка імя Максіма Горкага заўсёды адкрыта для сумеснай працы па прасоўванні, зберагання і рэнавацыі агульнай культурна-гістарычнай спадчыны.

Summary

The article describes the experience of the Brest regional library named after Maxim Gorky in the framework of the project “Historical symbols of Brest” to the 1000th anniversary of the city.



А.А. Суша. Лекцыя «Берасцейская Біблія як культурны брэнд горада, вобласці, краіны»



А.М. Свірыд. Лекцыя «Брэсцкая унія ў гісторыі Брэста і лёсах еўрапейскай цывілізацыі»




А.М. Вабішчэвіч. Лекцыя «Брэсцкі мір у гісторыі горада, краіны, свету»



У.В. Здановіч. Лекцыя «Абарона Брэсцкай крэпасці: падыходы да вывучэння і ацэнкі»